

*Т. В.* ***Валодзіна****.*

**ВАЛО́ДЗІНА** Таццяна Васілеўна (н. 8.9.1968, в. Суша Лепельскага раёна), фалькларыстка. Кандыдат філалагічных навук (1994). Скончыла БДУ (1990). З 1992 у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нац. АН Беларусі. Сфера навуковай дзейнасці — фалькларыстыка, этналінгвістыка, фразеалогія. Аўтар манаграфій «Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў» (1997) і «Семантыка рэчаў у духоўнай культуры беларусаў» (1999). Адзін з аўтараў кнігі «Малыя жанры: Дзіцячы фальклор» і энцыклапедычнага слоўніка «Беларуская міфалогія» (абедзве 2004). Найбольш значныя навуковыя публікацыі прысвечаны міфапаэтычным і этналінгвістычным пытанням нар. календара, нар. медыцыны беларусаў, этнакультурнаму партрэту цела чалавека.

*Тв.*: Мифоритуальный и этнолингвистический аспекты народной медицины белорусов: эпилепсия // Studia Litteraria Polono-Slavica, 6. Warszawa, 2001; «Суськія (сушанскія) словы» // Жывое наша слова: Дыялекталаг. зб. Мн., 2002; Этнофразеологическая антропология славян: босота // Проблемы славяноведения: Сб. науч. статей и материалов. Брянск, 2002. Вып. 4; Мифоритуальный и этнолингвистический аспекты народной медицины белорусов: волосень (на общеславянском фоне) // Там жа. Брянск, 2003. Вып. 5; Дыхатамія «свой — чужы» ў сферы ўяўленняў наіўнай антрапалогіі // Мовазнаўства. Літаратура. Культуралогія. Фалькларыстыка: XIII Міжнар. з'езд славістаў (Любляна, 2003): Дакл. бел. дэлегацыі. Мн., 2003; Из народной медицины белорусов // Живая старина. 2004. № 1.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ